### Література


1. Державний архів Рівненської області (далі – ДАРО). – Фонд Р. 281. – Оп. 1. – Спр.9. Дело об обьединении православной Автокефальной украинской церкви с Автономной православной церковью на Украине.
2. ДАРО. – Фонд Р.33. – Оп.2. – Спр. 13. Листування з Гебітскомісаром в справі релігійних питань.
3. Дюркгейм Э. О. Социология. Ее предмет, метод, предназначение. – М.: Канон, 1995.
4. *«За други своя» : материалы церковно-общественной конференции. – М.: Издательский Совет Русской Православной Церкви, 2005.*
5. Історія релігії в Україні: у 10-ти т. / [Редколегія: А.Колодний (голова) та ін.]; ред. Яроцький П.]. – К.: Український Центр духовної культури, 1996–1999. – Т. 3: Православ'я в Україні. – 1999.
6. Лебон Г. Психология народов и масс [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http:// www. bookap. by. Ru / sociopsy / lebon/oglav.shtm
7. Пірен М. Утвердження духовних цінностей громадянського суспільства і релігійна соціалізація особистості / Соціальна психологія: український науковий журнал. – Київ: Український центр політичного менеджменту, 2005. – №6.
8. Поспеловський Д. Тоталитаризм и религия [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http:// www.krotov.info/history
9. Стоколос Н.Г. Конфесійно-етнічні трансформації в Україні (XIX – перша половина XX ст.). – Рівне: РІС КСУ – ППФ „Ліста" – М., 2003.
10. Суятінова Л. Вплив релігії на процес соціалізації особистості // Соціальна психологія: український науковий журнал. – Київ : Український центр політичного менеджменту, 2006. – № 1 (15).
11. Сафронова А.Г. Психология религии. – К.: Ника-Центр, 2002.
12. Якунін Г. Введение – как-будто-бы не в жизнь – в кошмарное виденье [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http:// www.vehi.net/politika/yakunin.html
13. Юнг К.Г. Нераскрытая самость (современность и будущие) [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://www.jungland.ru/node/1589



### Summary

**Iryna Bulyha**

**The Influence of Totalitarian Regimes on the Socialization of the Orthodox Believer during the Word War in Ukraine**

In the article I.Bulyha analyses the peculiarities of the influence of totalitarian regimes on the processes of the orthodox believer's socialization, determinates the role of inner and outward factors in man's lifer during the crisis in the society caused by the Second World War.


**УДК 2 – 6 : 316. 422 : 2 (476)**

**© Віктор Адзіночанка**
**м. Гомель**

## ТРАНСФАРМАЦЫЯ РЭЛІГІЙНАЙ СІТУАЦЫІ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСІ

*У статті на основі статистичних даних аналізуються зміни релігійної ситуації в Білорусії за останні 20-ть років. Трансформація релігійної ситуації в країні розглядається як системний процес. Виділяються два аспекти цієї трансформації: політичний і власне релігійний. Аналізується специфіка релігійності населення Білорусії. Робиться висновок про те, що трансформація релігійної ситуації у Білорусії сильно залежить від політичних змін.*

**Ключавыя словы:** рэлігійная трансфармацыя, спецыфіка рэлігійнай сітуацыі, характар рэлігійнасці, заканадаўства аб свабодзе сумлення, міжрэлігійнае ўзаемадзеянне, талерантнасць, будучае рэлігіі.

Мы можам дакладана акрэсліць тыя храналагічныя межы, якія вызначаюць пачатак сучаснай Беларусі. Гэта распад Савецкага Саюза і прыняцце ў ліпені 1991 года Вярхоўным Саветам БССР Дэкларацыі аб дзяржаўнай незалежнасці. Утварылася самастойная дзяржава Беларусь. Як вынік – у краіне пачалася трансфармацыя амаль усіх сфер жыцця, у тым ліку і рэлігійнай. Адзначым, што трансфармацыя ў рэлігійнай сферы мела прынцыповы характар і аказала вельмі істотны ўплыў на

змены ў іншых галінах грамадскства. Звязана гэта было, па-першае, з тым, што стаўленне да рэлігіі ў грамадскай свядомасці памянялася на прама супрацьлеглае: раней яна разглядалася як "перажытак мінулага" і "адзіная легальна існуючая форма антыкамуністычнай ідэалогіі", зараз рэлігія стала "асновай духоўнасці" і "неад'емнай часткай нацыянальнай культурнай традыцыі". І, па другое, свабода рэлігіі, як і рынкавая эканоміка, а таксама палітычная дэмакратыя, была несумяшчальная са старой савецкай сістэмай. І само ўспрыманне рэлігіі не як нейкай маргінальнай з'явы, а як часткі існуючай грамадскай сістэмы прадугледжвала істотную трансфармацыю сістэмы ў цэлым. Трэба адзначыць, што трансфармацыйныя працэсы на Беларусі адбываюцца вельмі цяжка, мы сапраўды з'яўляемся постсавецкім грамадствам, кіраўніцтва краіны больш арыентуецца на старыя схемы паводзін, на тое, што было раней, а не на новыя формы грамадскага жыцця. У рэлігійнай сферы гэта праяўляецца ў тым, што ўлады спрабуюць пабудаваць узаемаадносіны з рэлігійнымі арганізацыямі па старых савецкіх узорах, безумоўна, адмаўляючыся пры гэтым ад атэістычных установак. Рэлігія (перад усім праваслаўе) выкарыстоўваецца цяперашнім кіраўніцтвам Беларусі ў сваіх ідэалагічных і палітычных мэтах.

Трансфармацыю рэлігійнай сітуацыі на Беларусі трэба разглядаць у кантэксце агульнай сістэмнай трансфармацыі грамадства. На наш погляд, тут трэба вылучыць два ўзаемазвязаныя, але істотна розныя працэсы: па-першае, гэта адмаўленне ад элементаў савецкай спадчыны, і па-другое, фарміраванне сістэмы незалежнага беларускага грамадства. Апошняе для Беларусі па меры яе гістарычнага развіцця як незалежнай краіны робіцца ўсё больш актуальным.. Пасля разбурэння ў пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя вялізарнага палітычнага ўтварэння, якое называлася "Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік" і узнікнення на яго месцы незалежных краін, для кожнай з іх востра паўстала пытанне: на якіх асновах будавацца далей. Трэба было вызначыць элементы структуравання будучай дзейнасці. Зараз ўжо відавочна, што розніца ў шляхах развіцця былых савецкіх рэспублік шмат у чым была абумоўлена гістарычнай і культурнай спадчынай кожнай з іх. Раней лічылася, што ёсць адзіны савецкі народ, з агульнай ментальнасцю, палітычным і эканамічным ладам. Сёння мы бачым, наколькі адрозніваюцца паміж сабой, напрыклад, краіны Прыбалтыкі і Сярэдняй Азіі. Шмат ў чым гэта абумоўлена рэлігійнай традыцыяй той ці іншай краіны. Таксама ўсё больш відавочнай робіцца розніца ў гістарычным і рэлігійным развіцці паміж трыма славянскімі краінамі: Беларуссю, Украінай і Расіяй. На наш погляд, выяўленне і аналіз гэтай розніцы для той сітуацыі, у якой зараз знаходзіцца Беларусь, з'яўляецца вельмі карысным.

**Актуальным** зрабілася асэнсаванне канкрэтнай спецыфікі трансфармацыі рэлігійнай сітуацыі на Беларусі, каб, кажучы словамі з Бібліі, "трымацца свайго шляху" (3 Цар. 8, 25). Рэлігійная сітуацыя ў краіне – адзін з істотных элементаў агульнай сітуацыі, калі рэлігійныя арганізацыі ўваходзяць у розныя сферы жыцця, і іх дзейнасць, а таксама ўзаемаадносіны паміж імі ўплываюць на тыя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве. Актуальнасць рэлігіязнаўчых даследаванняў набыла свой першапачатковы характар (ад познелац. *actualis – дзейсны*). Той ці іншы накірунак даследавання, характар пастаноўкіі пытанняў і зробленыя высновы з'яўляюцца часткай грамадскіх працэсаў.

На Беларусі інтэнсіўная вывучэнне рэлігійнай сітуацыі пачалося з канца 90-х. Перш за ўсё былі праведзены грунтоўныя сацыялагічныя даследаванні, у якіх на падаставе аналізу дадзеных па рэлігійнай самаідэнтыфікацыі жыхароў краіны былі зроблены высновы аб стане рэлігійнасці на Беларусі, тыпах адносін да рэлігіі (рэлігійны, квазірэлігійны, хістаючыйся, няверуючы), а таксама накірунках развіцця. Другі блок даследаванняў рабіўся з паліталагічных пазіцый, аналізаваўся стан рэлігійнасці ў грамадстве краіны, а таксама ўплыў рэлігій на агульную грамадскую і палітычную сітуацыю ў краіне. Трэба адзначыць, што ў гэтых даследаваннях быў выказаны афіцыйны пункт погляду, а менавіта паслядоўна праводзіліся два асноўныя палажэнні: па-першае, што на Беларусі назіраецца стабільная рэлігійная сітуацыя, выконваюцца правы веруючых і адсутнічаюць міжрэлігійныя канфлікты (гэта частка агульнай ідэалагічнай устаноўкі аб стабільнасці ў краіне), і па-другое, што на Беларусі пераважае праваслаўе (гэта было вынікам курсу на зближэнне з Расіяй, які праводзіўся да нядаўняга часу). Праблемы рэлігійнай сітуацыі аналізаваліся ў межах афіцыйнага палітычнага курса і самі з'яўляліся яго выражэннем. Трэба адзначыць, што фарміраванню дзяржаўнай ідэалогіі ўладамі Беларусі зараз надаецца вельмі вялікая ўвага. Існуе вучэбны курс "Асновы беларускай дзяржаўнай ідэалогіі", які з'яўляецца абавязковым у вну, і ў ім значнае месца адводзіцца ідэалагічным аспектам сучаснай рэлігійнай сітуацыі. Але, на наш погляд, зараз актуальны менавіта рэлігіязнаўчы падыход, даследаванне з улікам спецыфікі рэлігіі ў яе грамадскіх функцыях. Бо рэлігія ўяўляе собой сістэмнае ўтварэнне, якое мае сваю логіку развіцця, і не можа быць адэкватна інтэрпрэтавана ў паліталагічных альбо ідэалагічных тэрмінах. Як прыклад, мы можам прывесці становішча рэлігіі ў Савецкім Саюзе, Там яна трактавалася менавіта як ідэалагічнае утварэнне і, як паказаў вопыт, такая трактоўка аказалася памылковай. Справа не толькі ў тым, што пры ўсёй

жорсткасці антырэлігійнай палітыкі знішчыць рэлігію не ўдалося, але і ў тым, што барацьба з ёй чыста ідэалагічнымі сродкамі (не ўжываючы рэпрэсій) не дала ніякага плёну. Таму, на наш погляд, трансфармацыя рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі павінна быць апісана перш за ўсё сродкамі рэлігіязнаўства, што прадугледжвае выяўленне сутнасных рысаў рэлігіі.

**Мэтай нашага даследавання** з'яўляецца аналіз спецыфікі тых трансфармацыйных працэсаў, якія адбываюцца ў рэлігійнай сітуацыі на Беларусі на працягу апошніх 20 гадоў.

Для выканання гэтай мэты намі ставяцца наступныя задачы:

1) вызначыць месца і ролю рэлігіі ў сістэме грамадскага жыцця;

2) паказаць спецыфіку выканання рэлігіяй сваіх функцый (перш за ўсё інтэграцыйнай і рэгулюючай) у беларускім грамадстве;

3) прааналізаваць беларускае заканадаўства аб свабодзе сумлення з пункту погляду яго ідэалагічнай і кантралюючай функцый;

4) на падставе аналіза сацыялагічных дадзеных даць характарыстыку сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі, а таксама тэндэнцый яе развіцця;

5) прааналізаваць гістарычныя падставы рэлігійнай талерантнасці на Беларусі.

Пры аналізе сучаснага рэлігійнага становішча на Беларусі актуальнымі, на наш погляд, з'яўляюцца наступныя палажэнні: 1. Рэлігія – неад'емны кампанент грамадства. Мы не можам назваць народа, у якога не было б рэлігіі. Усе спробы выкаранення рэлігіі не далі выніку. Напрыклад, на Беларусі нават у часы самых жорсткіх атэістычных ганенняў дзейнічалі цэрквы, падпольна працавалі шмат якія рэлігійныя арганізацыі, амаль сто працэнтаў насельніцтва святкавала Пасху. 2. Рэлігія зараз аказвае ўплыў на грамадскую свядомасць і спосабы паводзін веруючых (іх стаўленне да працы, сямейныя паводзіны, палітычныя погляды). Роля рэлігіі, як аб гэтым сведчаць сацыялагічныя даныя, у нашым грамадстве ўзрастае, і гэтая тэндэнцыя ў бліжэйшы час захаваецца. 3. У далейшым будзе ўзмацняцца спецыфіка рэлігійнай сітуацыі на Беларусі і адначасова яе падабенства ў прававым сэнсе на рэлігійную сітуацыю ў еўрапейскіх краінах.

У межах нашага аналізу мы будзем разглядаць рэлігію праз прызму яе функцый, гэта значыць, тых роляў, якія яна выконвае ў грамадстве. Менавіта такі падыход да аналізу рэлігіі з'яўляецца моцным бокам марксісцкай метадалогіі, калі рэлігія апісваецца праз яе ўплыў на паводзіны людзей. Але, на наш погляд, немагчыма адэкватна апісаць рэлігію толькі праз яе функцыі, як гэта рабілася ў марксізме. Спачатку трэба тым ці іншым чынам вызначыць спецыфіку рэлігіі, і толькі потым на гэтай падставе аналізаваць тое, як рэлігія функцыянуе ў грамадстве.

Трэба адзначыць, што само пералічэнне функцый рэлігіі можа мець ідэалагічны сэнс. Так, напрыклад, у адпаведнасці з устаноўкамі афіцыйнай марксісцкай ідэалогіі, асноўнай функцыяй рэлігіі абвяшчалася ілюзорна-кампенсатарная – лічылася, што рэлігія дае чалавеку суцяшэнне ў яго жыццёвых цяжкасцях, абяцаючы ўзнагароду ў "іншым" свеце. І ў адпаведнасці з гэтымі ўстаноўкамі, у сацыялістычным грамадстве функцыя рэлігіі зводзілася да псіхалагічнай падтрымкі чалавека ў яго бедах (лічылася, што чалавек ідзе ў царкву, калі ў яго нейкае гора, і ў канцы свайго жыцця, каб забяспечыць сабе існаванне пасля смерці), а таксама да задавальнення культавых патрэб – рэлігійным арганізацыям дазвалялася рабіць абрады (хрышчэнне, адпяванне і г.д.), але забаранялася займацца дабрачыннай і адукацыйнай дзейнасцю. Зараз рэлігія трактуецца як "аснова маральнасці" і "частка традыцыі". Адпаведна змянілася і ўзаемадзеянне ўладаў з рэлігійнымі арганізацыямі. Праваслаўных святароў запрашаюць на правядзенне воінскіх прысяг, асвячэнне будынкаў, выступленні перад навучэнцамі, заключаны шэраг пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж Беларускай праваслаўнай царквой і дзяржаўнымі ўстановамі. Таксама такое разуменне ролі рэлігіі ў сучасным беларускім грамадстве ўплывае і на ўзаемаадносіны ўлад з іншымі, неправаслаўнымі веравызнаннямі.

Мы лічым, што пры вылучэнні функцый рэлігіі неабходна: 1) выходзіць з нейтральнага і найменш ідэалагічна абцяжаранага разумення рэлігіі; 2) абапірацца на аналіз той рэальнай ролі, якую рэлігія выконвае ў сучасным беларускім грамадстве; 3) пералічэнне функцый рэлігіі павінна мець сітэмны характар. Мы вылучаем такія функцыі рэлігіі, як: светапоглядная – асэнсаванне і тлумачэнне свету; сэнсаствараючая – наданне сэнсу чалавечаму жыццю, падтрымка чалавека ў цяжкасцях і паказ выхаду з іх; інтэграцыйная – аб'яднанне прыхільнікаў адной веры; рэгулюючая – фарміраванне нормаў паводзін.

Для Беларусі зараз актуальныя інтэграцыйная і рэгулюючая функцыя, на якіх мы спынімся.

Трэба адзначыць, што ў гісторыі нашай краіны рэлігія адыграла хутчэй дэзінтэграцыйную, чым інтэграцыйную ролю. Тэрыторыя Беларусі знаходзілася на перакрыжаванні інтарэсаў дзвюх дзяржаў: праваслаўнай Расіі і каталіцкай Польшчы, якія імкнуліся выкарыстаць рэлігію ў сваіх палітычных мэтах. Таму раней, як правіла, прыняцце беларусамі праваслаўя схіляла іх у бок Расіі, а каталіцтва – у бок Польшчы. Пра гэта яшчэ ў пачатку XX стагоддзя пісаў адзін з найбольш вядомых дзеячоў беларускай

культуры паэт Янка Купала: “Апрача палітычнай і эканамічнай залежнасці, была і другая прычына, што асляпіла светапогляд беларуса, – гэта рэлігійная нязгода двух хрысціянскіх абрадаў у нашым краі: каталіцтва і праваслаўя. Гэтыя дзве царквы – заходняя і ўсходняя, вядучы вечную спрэчку паміж сабой, раздзяляюць наш ядыны народ на дзве часці, адных і тых жа дзяцей сваёй маткі-зямлі водзяць паміж сабой, даводзячы нават часта да бойкі за святы знак хрысціянства – крыж…Гэтае змаганне дзвюх вер не толькі дзеліць беларусаў на дзве часткі па рэлігіі, але, самае важнае, забівае ў іх свядомасць і пачуццё нацыянальнай еднасці. Беларусу-католіку ўгаварваюць, што раз ён католік, то ён паляк, і не павінны братацца з тымі, хто іншай веры; беларусу праваслаўнаму кажуць, што раз ён праваслаўны, то ён расіец, і католіка-беларуса павінен сцерагчыся, бо ён – паляк” [9, с. 212–213]. Трэба сказаць, што Купала казаў аб рэальных праблемах тых часоў (гэтыя словы былі апублікаваныя ў газеце “Наша ніва” ў 1914 г.). Можна прывесці іншы прыклад падобнага становішча. Калі, згодна з указам аб верацярпімасці 1905 года, было дазволена пры навучанні Закону Божаму для прадстаўнікоў неправаслаўных канфесій карыстацца "прыроднай мовай вучняў", на Беларусі адразу ж узнікла пытанне, якую мову лічыць для тутэйшых католікаў роднай. Большасць каталіцкага духавенства па традыцыі лічыла, што гэтай мовай з'яўляецца польская, расійскія чыноўнікі – руская. Родная мова беларусаў не ўлічвалася.

Але трэба адзначыць, што такая сітуацыя – вынік выкарыстання рэлігіі ў палітычных мэтах: у Расійскай імперыі дзяржаўнай рэлігіяй было праваслаўе, тыя, хто імкнуўся адрадзіць Рэч Паспалітую (не толькі палякі, але і беларусы), супрацьпастаўлялі яму каталіцтва. У гады савецкіх атэістычных рэпрэсій, калі праследаваліся ўсе канфесіі, падобнага роду супярэчнасці на Беларусі страцілі свой сэнс. Зараз у нашай краіне існуюць тэндэнцыі беларусізацыі як у каталіцтве, так і ў праваслаўі. У каталіцтве гэта звязана з рашэннем Другога Ватыканскага сабора (1962–1965) аб вядзенні набажэнстваў на нацыянальных мовах. У Беларускай праваслаўнай царкве прыязнае стаўленне да беларускай мовы абумоўлена мудрай палітыкай у гэтым пытанні яе кіраўніцтва. Напрыклад, пад час свайго візіту на Беларусь у канцы верасня 2009 года Патрыярх Маскоўскі і ўсёй Русі Кірыл цытаваў у сваіх прамовах беларускіх паэтаў, што ва ўмовах нашай сітуацыі было ўспрынята як знак павагі да беларускай культуры.

Што тычыцца рэгулюючай функцыі рэлігіі, дык тут трэба сказаць аб спецыфіцы рэлігійнасці большасці насельніцтва Беларусі.

Прыкладна з 1989 года ў Беларусі назіраецца паступовае адраджэнне рэлігіі. Галоўным аб’ектыўным паказчыкам гэтага з’яўляецца рост колькасці рэлігійных арганізацый. Так, за перыяд з 1988 па 2009 гады колькасць рэлігійных суполак павялічылася амаль у 4 (з 768 да 3062), а рэлігійных кірункаў – у 3 разы. Пік росту назіраўся ў 1995 годзе, калі было зарэгістравана 344 рэлігійных суполкі (у 2008 – 59). Згодна з сацыялагічнымі апытаннямі, напярэдадані распаду Савецкага Саюзу да ліку няверуючых адносіла сябе каля 65% насельніцтва рэспублікі, а ў 1998 – 25,4%, гэта значыць, амаль у 2,5 разы менш. За гэты ж час амаль удвая вырасла катэгорыя тых, хто лічыць сябе веруючым – з 22 до 37,5%. Аднак гэтыя лічбы не павінны ўводзіць у зман – як паказваюць сацыялагічныя даследаванні, рэлігійнасць жыхароў Беларусі мае пераважна дэкларатыўны характар: веруючымі называюць сябе прыкладна 50% насельніцтва, у той час рэгулярна наведваюць храмы і выконваюць прадпісанні сваёй рэлігіі не больш 7% насельніцтва. Аднак модным зрабілася дэманстраваць сваю рэлігійнасць. Асабліва распаўсюджанай гэтая мода была ў 90-я гады мінулага стагоддзя, калі на хвалі перабудовы імкнуліся адмовіцца ад усяго савецкага і звярнуцца да іншых каштоўнасцей. У рэлігійнай сферы зараз пануе неакрэсленая духоўнасць, лічыцца, што трэба ў нешта верыць. Большасць беларусаў атаясамлівае сябе з праваслаўем, але размова ў дадзеным выпадку ідзе не аб рэлігійнай, а аб культурнай ідэнтыфікацыі – чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да акрэсленай традыцыі. За гады Савецкай улады ў большасці людзей было страчана само разуменне таго, што такое рэлігія. Яна зводзілася, па-першае, да выканання традыцыйных абрадаў (як прыклад: амаль 100% насельніцтва Беларусі і пры камуністах святкавала Пасху) і, па-другое, да сродку суцяшэння чалавека ў яго бедах. Вельмі часта рэакцыяй людзей на змены пачатку 90-х гадоў, якія разбурылі звыклы лад іх жыцця, быў зварот да рэлігіі.

Як паказалі сацыялагічныя даследаванні, прыкладна палова насельніцтва верыць ў варажбу, сурокі і г.д., прычым ў гэта ж верыць і больш паловы людзей, якія лічаць сябе веруючымі. Цікава, што ў гэтыя і падобныя ім рэчы верыць і значная частка людзей, якія лічаць сябе няверуючымі. Такім чынам, на нашую думку, светапогляд і паводзіны большасці насельніцтва Беларусі трэба акрэсліць словам не “рэлігія”, але “забабоны”. Такім чынам, рэгулюючую функцыю на Беларусі зараз выконваюць не столькі хрысціянскія ці іншыя рэлігійныя арганізацыі са сваім веравучэннем, але стыхійная рэлігійнасць, якая вырастае са штодзённага жыцця людзей. Да гэтага дадаюцца рэшткі вельмі моцнай язычніцкай традыцыі, якая існавала на Беларусі. Напрыклад, значная частка насельніцтва зараз святкуе праваслаўную Радуніцу. Але па тым, як гэта робіцца, можна зрабіць вывад, што гэта – былыя Вясеннія Дзяды (“дзядамі” на Беларусі называюць духаў памёрлых продкаў). Людзі

ідуць на могілкі, ядуць там і п'юць і частку ежы і пітва пакідаюць на магілах. Гэта чыста язычніцкі звычай кармлення "дзядоў". Яго рэлігійны сэнс большасць людей зараз не асэнсоўвае, гэта ўспрымаецца як традыцыя. Але, безумоўна, што такія дзеянні знаходзяцца па-за межамі хрысціянства.

Адной са спецыфічных рыс сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі з'яўляецца тое, што дзяржава імкнецца яе кантраляваць. Дарэчы, гэта частка агульнай грамадскай сітуацыі ў краіне – як грамадскае жыццё тут знаходзіцца пад жорсткім кантролем. Беларускае заканадаўства аб рэлігіях пабудавана такім чынам, каб даць уладам магчымасць умешвацца ў гэтую сферу. У беларускай Канстытуцыі адсутнічае прынцып аддзяленнея рэлігіі ад дзяржавы, і таму ўзнікае пытанне аб свецкім характары дзяржавы. У Арт. 16 Канстытуцыі запісана…"Узаемадзеянні дзяржавы і рэлігійных арганізацый рэгулююцца законам з улікам іх уплыву на фарміраванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Тут абвяшчаецца фактычна няроўнае стаўленне да рэлігій з боку дзяржавы, абумоўленае іх уплывам на фарміраванне "духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа" [6, с. 8].

Гэтае палажэнне Канстытуцыі было замацавана ў прынятай у 2002 годзе новай рэдакцыі закона "Аб свабоде сумлення і рэлігійных арганізацыях". Трэба адзначыць, што яе прыняцце выклікала рэзкую крытыку з боку амаль усіх рэлігійных кірункаў на Беларусі (за выключэннем праваслаўнай царквы), а таксама праваабарончых арганізацый. У Прэамбуле новай рэдакцыі закона аб свабодзе сумлення сказана: "Гэты Закон... вызначае прававыя асновы стварэння і дзейнасці рэлігійных арганізацый, выходзячы з:

- права кожнага на свабоду сумлення і свабоду веравызнання, а таксама на роўнасць перад законам незалежна ад стаўлення да рэлігіі;
- роўнасці рэлігій перад законам;
- прызнання вызначальнай ролі Праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа;
- духоўнай, культурнай і гістарычнай ролі Каталіцкай царквы на тэрыторыі Беларусі;
- неаддзельнасці ад агульнай гісторыі народа Беларусі Евангеліцка-лютэранскай, царквы, іудаізму і ісламу;
- неабходнасці садзеяння дасягненню ўзаемнага разумення, цярпімасці і павагі рэлігійных пачуццяў грамадзян у пытаннях свабоды сумлення і веравызнання" [4, с. 3].

Такім чынам, з 25 рэлігійных накірункаў, якія зараз існуюць на Беларусі, у Прэамбуле ўзгадана толькі пяць, пры гэтым вызначальная роля "ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа" прыпісваецца праваслаўю, астатнія чатыры канфесіі толькі ўзгадваюцца. На нашу думку, падобны падыход адпавядае расійскім рэаліям, дзе, сапраўды, праваслаўная царква адыграла значную ролю ў фарміраванні гістарычнай і культурнай традыцыі. Але ў гісторыі Беларусі значная частка культурных і дзяржаўных дзеячоў належалі да каталіцтва. Католікам быў і першадрукар на ўсходнеславянскіх землях Францыск Скарына – знакавая постаць ў беларускай культуры. Апроч таго, у адрозненні ад Расіі, на нашых землях быў вельмі моцны рэфармацыйны рух. Такія вядомыя дзеячы беларускай культуры, як Сымон Будны і Васіль Цяпінскі былі пратэстанцкімі прапаведнікамі. Апроч таго, у Прэамбуле новага беларускага закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях" не ўзгаданы вельмі шматколькасныя пратэстанцкія кірункі (напрыклад, хрысціяне веры евангельскай (пяцідзесятнікі) – гэта другая па колькасці зарэгістраваных рэлігійных арганізацый канфесія на Беларусі). І хаця ў заканадаўстве не ўжываецца паняцце "нетрадыцыйныя рэлігіі", але фактычна тыя рэлігійныя накірункі, якія не ўзгаданыя ў Прэамбуле, успрымаюцца ў якасці менавіта такіх.

Але трэба сказаць, што дзяржаўныя органы, якія адказваюць за рэлігійную сітуацыю ў краіне, праводзяць даволі гнуткую палітыку, улічваючы беларускія рэаліі.

Для ілюстрацыі сучаснай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі прывядзём статыстычныя дадзеныя па колькасці рэлігійных суполак на 1 студзеня 2009 г.:

| Найменне канфесіі | Усяго па рэспубліцы |
|---|---|
| Праваслаўная царква | 1473 |
| Стараверская царква | 32 |
| Рыма-каталіцкая царква | 467 |
| Католікі лацінскага абраду | 1 |
| Грэка-каталіцкая царква | 14 |
| Рэфармацкая царква | 1 |

| | |
|---|---|
| Лютэранская царква | 27 |
| Евангельскія хрысціяне-баптысты | 269 |
| Іаганская царква | 1 |
| Новаапостальская царква | 21 |
| Прэсвітэрыянская царква | 1 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 500 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 54 |
| Хрысціяне веры апостальскай | 9 |
| Царква Хрыстова | 5 |
| Месіянскія суполкі | 2 |
| Адвентысты сёмага дня | 72 |
| Сведкі Іеговы | 26 |
| Мармоны | 4 |
| Іудзейская рэлігія | 29 |
| Прагрэсіўны іудаізм | 17 |
| Мусульманская рэлігія | 25 |
| Бахаі | 5 |
| Крышнаіты | 6 |
| Армянская апостальская царква | 1 |
| **Усяго** | **3062** |

Такім чынам, бачна, што для Беларусі характэрна поліканфесійнасць. Самай вялікай канфесіяй, калі судзіць па колькасці зарэгістраваных суполак, з'яўляецца праваслаўе (1473 суполкі), потым ідуць хрысціяне веры евангельскай (500) і рыма-каталікі (467). Пытанне аб колькасці прыхільнікаў той ці іншай канфесіі на Беларусі з'яўляецца даволі спрэчным. Афіцыйна лічыцца, што прыкладна 50% насельніцтва краіны – веруючыя, з іх прыкладна 80% – праваслаўныя, 10% – католікі, і 2% – пратэстанты. Розніца паміж працэнтам прыхільнікаў пратэстанцтва і колькасцю зарэгістраваных суполак тлумачыцца тым, што апошнія, быццам бы, вельмі маленькія. На наш погляд, тут ідзе супастаўленне розных паказчыкаў. Бо падлік ідзе на падставе самавызначэнне чалавека, таго, да якой веры ён сам сябе адносіць. У праваслаўі і пратэстанцтве гэтае аднясенне мае розны сэнс. Як правіла, аднясенне да праваслаўя мае характер не рэлігійнай, але культурнай ідэнтыфікацыі. Чалавек адносіць сябе да праваслаўнай царквы таму, што ў дзяцінстве быў у ёй хрышчоны, альбо ў сілу ўяўленняў, што праваслаўе – "усходнеславянская рэлігія". Калі ж чалавек заяўляе аб сваёй прыналежнасці да пратэстанцтва, у гэта ўкладваецца зусім іншы сэнс. Як правіла, гэта азначае, што ён рэгулярна наведвае суполку, прымае ўдзел у яе жыцці, вывучае Біблію і суадносіць яе палажэнні са сваім жыццём. Таму, на наш погляд, трэба праводзіць далейшыя даследаванні для аналізу рэальнай рэлігійнай сітуацыі на Беларусі.

Відавочна, што ні адзін з рэлігійных накірункаў у нашай краіне не з'яўляецца пераважаючым і не можа прэтэндаваць на дамініраванне. Трэба падкрэсліць, што Беларусь – гэта традыцыйна поліканфесійная дзяржава, на яе тэрыторыі мірна жылі прадстаўнікі самых розных рэлігій. У нас не было сур'ёзных сутыкненняў, а таксама праследаванняў на рэлігійнай глебе. Для беларусаў была характэрная верацярпімасць. У Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 года было запісана: «А таксама прывілеем, прысягаю нашай вырашана мір паміж рознымі рэлігіямі бярэгчы...А ў сувязі з тым, што ў Рэчы Паспалітай існуе не малая розніца ў адносінах веры хрысціянскай. Папярэджваючы тое, каб па гэтай прычыне паміж людзьм сутыкненні якія-небудзь шкодныя не пачаліся, якія ў іншых каралеўствах ясна бачым, абяцаем тое сабе сумесна за нас і за нашчадкаў нашых на вечныя часы пад абавязкам прысягі, пад вераю, гонарам і сумленнем нашым, што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры. Мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з рознасцю ў веры і з адрозненнем у цэрквах крыві не праліваць» [18, с. 112–113].

Трэба таксама адзначыць, што хаця рэлігійная сітуацыя ў сучаснай Беларусі мае свае праблемы, але ў цэлым для яе характэрна мірнае суіснаванне прадстаўнікоў розных канфесій, а таксама наяўнасць міжрэлігійнага дыялогу. Яго асноўным ініцыятарм з'яўляецца праваслаўная царква. На ўзроўні рэспубліканскага кіраўніцтва наладжаны вельмі добрыя ўзаемаадносіны паміж праваслаўнымі і католікамі, ідзе ўзаемадзеянне з евангельскімі хрысціянамі-баптыстамі, праведзены вельмі прадстаўнічыя канферэнцыі па пытаннях дыялогу з мусульманамі і іудзеямі.

Таксама мы можам разгледзець тэндэнцыі росту рэлігійных суполак у розных канфесіях на Беларусі па гадах:

| Канфесія | Колькасць рэлігійных суполак | | | | | Рост рэлігійных суполак | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | На 1.01 1988 | На 1.01 2006 | На 1.01 2007 | На 1.01 2008 | На 1.01 2009 | 1988-2008 гг. | У 2007 г. | У 2008 г. |
| Праваслаўная царква | 399 | 1349 | 1399 | 1431 | 1473 | 1032 | 32 | 42 |
| Стараверская царква | 22 | 33 | 33 | 32 | 32 | 10 | -1 | 0 |
| Рыма-каталіцкая царква | 121 | 438 | 440 | 457 | 467 | 336 | 17 | 10 |
| Каталікі лацінскага абраду | 0 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| Грэка-каталіцкая царква | 0 | 13 | 13 | 14 | 14 | 14 | 1 | 0 |
| Рэфармацкая царква | 0 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| Лютэранская царква | 0 | 25 | 27 | 27 | 27 | 27 | 0 | 0 |
| Евангельскія хрысціяне-баптысты | 171 | 265 | 267 | 268 | 269 | 97 | 1 | 1 |
| Іаганская царква | 0 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| Нова-апостальская царква | 0 | 20 | 21 | 21 | 21 | 21 | 0 | 0 |
| Прэсвітэрыянская царква | 0 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| Хрысціяне веры евангельскай | 39 | 488 | 493 | 494 | 500 | 455 | 1 | 6 |
| Хрысціяне поўнага Евангелля | 0 | 54 | 54 | 54 | 54 | 54 | 0 | 0 |
| Хрысціяне веры апостальскай | 0 | 9 | 9 | 9 | 9 | 9 | 0 | 0 |
| Царква Хрыстова | 0 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 0 | 0 |
| Месіянскія суполкі | 0 | 1 | 2 | 2 | 2 | 2 | 0 | 0 |
| Адвентысты сёмага дня | 11 | 72 | 74 | 73 | 72 | 62 | -1 | -1 |
| Сведкі Іеговы | 0 | 26 | 26 | 26 | 26 | 26 | 0 | 0 |
| Мармоны | 0 | 4 | 4 | 4 | 4 | 4 | 0 | 0 |
| Іудзейская рэлігія | 1 | 28 | 29 | 29 | 29 | 28 | 0 | 0 |
| Прагрэсіўны іудаізм | 0 | 17 | 17 | 17 | 17 | 17 | 0 | 0 |
| Мусульманская рэлігія | 1 | 24 | 24 | 24 | 25 | 23 | 0 | 1 |
| Бахаі | 0 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 0 | 0 |
| Крышнаіты | 0 | 5 | 6 | 6 | 6 | 6 | 0 | 0 |
| Армянская апостальская царква | 0 | 1 | 1 | 1 | 1 | 1 | 0 | 0 |
| **Усяго** | **765** | **2886** | **2953** | **3003** | **3062** | **2238** | **50** | **59** |

Але, калі казаць аб прыведзеных у табліцы дадзеных, дык трэба заўважыць, што яны не адлюстроўваюць цалкам рэлігійную сітуацыю ў краіне. Бо ўлады Беларусі, выходзячы з ідэалагічных і палітычных установак, імкнуцца стрымаць рост колькасці каталіцкіх і пратэстанцкіх суполак і паскорыць праваслаўных. Пратэстантаў гэта тычыцца ў найбольшай ступені, у іх вялікія праблемы з рэгістрацыяй новых суполак і будаўніцтвам храмаў.

Гаворачы аб тэндэнцыях развіцця рэлігійнай сітуацыі ў нашай краіне, трэба адзначыць, што тыя канцэпцыі 19 стагоддзя, у якіх сцвярджалася непазбежнасць знікнення ў будучым рэлігіі, не пацвердзіліся. Гэта тычыцца як марксісцкай ідэі аб тым, што па меры паляпшэння жыцця асноўнай масы насельніцтва і рэальным вырашэнні існуючых праблем знікне неабходнасць у ілюзорным суцяшэнні, якое дае рэлігія, так і канцэпцыі А. Конта, які вылучаў у гісторыі чалавецтва тры стадыі: рэлігійную, метафізічную і навуковую і звязваў адміранне рэлігіі з паступовым развіццём чалавечых ведаў. Уплыў рэлігіі ў еўрапейскай культуры і зараз застаецца даволі вялікім, але паступова зніжаецца колькасць людзей, якія прымаюць удзел у рэлігійным жыцці. Вельмі высокі ўзровень рэлігійнасці ў суседняй з намі Польшчы – 95% насельніцтва лічаць сябе католікамі. Традыцыйна рэлігійнай з'яўляецца самая заможная краіна свету – ЗША. У Беларусі таксама назіраецца відавочная тэндэнцыя павялічэння ўплыву рэлігіі.

Аналізуючы рэлігійную сітуацыю ў нашай краіне, скажам таксама аб моднай зараз канцэпцыі "сутыкнення цывілізацый" амерыканскага прафесара С. Хантынгтона. Ён лічыў, што пасля канца "халоднай вайны" барацьба ў свеце не знікне і нават будзе абвастрацца, але атрымае новы выгляд. На месца супрацьстаяння дзвюх сістэм – сацыялістычнай і капіталістычнай – прыйдзе супрацьстаянне паміж цывілізацыямі. Менавіта на лініях разлому паміж імі павінны адбывацца канфлікты. Беларусь, па Хантынгтону, знаходзіцца менавіта на такой лініі разлому паміж заходняй і праваслаўнай цывілізацыямі. Такім чынам, сцвярджаецца, што тэрыторыя нашай краіны – гэта тэрыторыя канфліктаў. Прычым апошнія маюць перш за ўсё рэлігійную аснову, бо дэкларуецца, што заходняя цывілізацыя заканчваецца там, дзе заканчваецца заходняе хрысціянства (каталіцтва і пратэстанцтва).

Адразу адзначым, што разважанні Хантынгтона супярэчаць фактычным дадзеным. Ён лічыць, што мяжа паміж праваслаўем і каталіцтвам праходзіць з поўначы на поўдзень па сярэдзіне тэрыторыі Беларусі, прыкладна па лініі Расоны–Мінск–Столін. Па ўсходні бок ад яе распаўсюджана праваслаўе, па заходні – каталіцтва. Але ж гэта не так. Як сведчаць статыстычныя дадзеныя, найбольшая колькасць праваслаўных суполак знаходзіцца ў заходняй Брэсцкай вобласці (358), а не ва ўсходніх Гомельскай і Магілёўскай (адпаведна 197 і 109). Але, тым не менш, у Беларусі ёсць праблема ўзаемадзеяння паміж рознымі канфесіямі, перш за ўсё хрысціянскімі, бо Беларусь – гэта поліканфесійная дзяржава, і менавіта з гэтага трэба выходзіць, калі аналізаваць будучае рэлігіі ў ёй.

На наш погляд, трансфармацыя рэлігійнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі будзе абумоўлена перад усім унутрырэлігійнымі прычынамі. Бо кожная рэлігія ўяўляе сабой сістэмнае ўтварэнне, якое мае сваю логіку развіцця і ў залежнасці ад яе займае адпаведнае месца ў грамадстве. Зараз на Беларусі паступова адбываецца ўзмацненне талерантнасці, а таксама развіццё міжрэлігійнага дыялогу. Фактарам, які, на наш погляд, адмоўна ўплывае на развіццё рэлігійнай сітуацыі на Беларусі, з'яўляецца надзвычай моцны кантроль дзяржавы. Пакуль што менавіта дзяржава шмат у чым вызначае рэлігійную сітуацыю на макраўзроўні. Па меры аслаблення гэтага кантролю, на наш погляд, у рэлігійнай сітуацыі на Беларусі адбудуцца істотныя змены.

## Література


1. Алешко, А. Место и роль православной церкви в современной Беларуси / А. Алешко // Государственно – конфессиональные отношения в Республике Беларусь: Материалы заседания «круглого стола» 22 апреля 1999 года. – Минск, 1999.
2. Вопросы свободы совести и религиозных организаций в Республике Беларусь: Сборник документов и материалов / Авт.-сост. М. В. Цвилик; под ред. В. И. Новицкого. – Мн.: Издательство «Четыре четверти», 2005.
3. Головко, А. А. Свобода совести и взаимоотношения государства с церковью / А. Головко // Весн. Бел. ун–та. Сер.3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1996.– № 2.
4. Закон "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях": закон Рэспублікі Беларусь. – Мн.: «Беларусь», 1996.
5. Земляков, Л .Е. Некоторые аспекты трансформации современных религиозных верований в Республике Беларусь / Л. Е. Замляков // Проблемы управления.– 2006.– № 1.
6. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі). – Мн.: «Беларусь», 2004.
7. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX ст.) /В. Грыгор'ева [ і інш.]. – Мн.: «Экаперспектыва», 1998.
8. Котляров, И. В. Республика Беларусь в конфессиональном измерении / И. В. Котляров, Л. Е.; Минский ин-т управления. – Мн.: Изд-во МИУ, 2004.

9. Купала Я. Вера і нацыянальнасць / Я. Купала //Збор твораў у сямі тамах, Т. 7. – Мн. "Навука і тэхніка", 1976.
10. Миронов, А.В. Государственно–церковные отношения / А. В. Миронов, Ю. А. Бабинов // Соц.–гуманит. знания. – 1999.– № 2.
11. Новикова Л.Г., Белая Е.А. Конфессиональные особенности массовой религиозной культуры в современной Беларуси / Л.Г. Новикова Е.А. , Е.А. Белая //Беларусь и Россия: социальная сфера и социокультурная динамика: Сб. научн. тр. / Под общ. ред. О.В. Пролесковского, Г.В. Осипова. – Мн.: ИАЦ, 2008.
12. Новикова Л. Молодежь и религия / Л. Новикова // Молодежь и гражданское общество: Белорусский вариант; под. ред. О. Манаева. – Мн.: Изд. В.М. Скакун, 1999.
13. Одиноченко, В.А. Право на свободу совести в Беларуси / В. А. Одиноченко. – Мн.: Тесей, 2006.
14. Оржеховский, И.В. Церковь и государство в современной Беларуси / И. В. Оржеховский // Весн. Бел. дзярж. ун–та. Сер.3. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 1996. – № 3.
15. Пирожник, И.И. Беларусь после «религиозного бума»: что изменилось? / И. И. Пирожник [и др.] // Социология.—2006.
16. Пирожник, И.И. Социально-географические тенденции изменения конфессиональной структуры населения Беларуси / И. И. Пирожник [и др.] // Весн. Бел. дзярж. ун-та. Сер.2. Геаграфія. –2007. –№ 1.
17. Рудкоўскі, П. Рэлігія як фактар геапалітычнага самавызначэння Беларусі / Пётра Рудкоўскі // Новости НИСЭПИ, 2007. – Вып.1.
18. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: Тэксты. Давед. Камент. /Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш]. – Мн.: БелСЭ, 1989.



**Summary**

**Viktar Adzinochanka**

**The transformation of the religious situation in Belarus nowadays**

The charges of the religious situation in Belarus of the last 20 years are analyzed in the article based on the statistic facts. The transformation of the religious situation in the country is considered as a systematic process. There are two aspects of this transformation: political and proper religious. The specification of the Belarusian population religiosity is analyzed. The conclusion is the following: the transformation of the religious situation in Belarus nowadays is highly depended on the political changes.


**УДК 274/278:364.3**


**© Маріан Божеску**
**м. Чернівці**


## ОСНОВНІ ПІДХОДИ ТА ТЕНДЕНЦІЇ У ВИВЧЕННІ СОЦІАЛЬНИХ СТЕРЕОТИПІВ


*У статті проаналізовано основні підходи до вивчення соціальних стереотипів, починаючи від виникнення цього поняття і до його тлумачення на сучасному етапі. Дослідження виявило тенденцію вивчення стереотипів, з одного боку, від рівня особистості та процесів соціалізації до мотивації виникнення стереотипів, міжгрупової конкуренції та цільових груп, та від сприйняття стереотипів як виключно деструктивних явищ до вивчення їхньої когнітивної парадигми та соціальної ролі, з іншого.*


**Ключові слова:** стереотипи, соціалізація, особистість, ідентичність.

**Актуальність роботи** зумовлена необхідністю систематизувати погляди на соціальні стереотипи.

**Метою** даного дослідження є визначення основних підходів, тенденцій та напрямів подальших досліджень соціальних стереотипів.

Досягнення поставленої мети передбачає виконання таких **завдань**: проаналізувати головні підходи до вивчення соціальних стереотипів, простежити тенденції та окреслити можливі шляхи подальших досліджень.

Аналізу стереотипів присвячено роботи таких видатних дослідників як Д. Кац і К. В. Бралі (1933), Т.В. Адорно (1950), Г.В. Олпорт (1954), Г. Тажфел (1981), П.Дж. Оукс та Дж.С. Тернер (1990), Дж. Дакіт (1994) та ін.